# Журналістыка

Я.Ф. *КОНЕУ*

## ФАРМІРАВАННЕ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ БЕЛАРУСІ Ў СЯРЭДЗІНЕ XVIII - ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX ст.

Показано, что в середине XVIII - первой половине XIX в» Беларусь находилась в числе информационно развитых стран мира. Польскоязычные издания, которые превалировали на территории этнической Беларуси, создавали интеллектуальную основу для будущего общественного прорыва к Национальной Идее.

It is shown that in the middle of XVIII - XIX centuries Belarus was among the most informationally developed countries of the world. Polish language editions, that predominated on the territory of ethnic Belarus, created intellectual basis for future public break through to National Idea.

Перыяд 3 сярэдзіны XVIII ст., калі Рэч Паспалітая няўмольна хілілася да сацыяльна-палітычнага заняпаду, які завяршыўся падзеламі 1772-1795 гг., і да першай трэці XIX ст. (калі канчаткова ўмацавалася сістэма царскага кіравання на далучаных да Расійскай імперыі беларускіх землях) надзвычай важны для асэнсавання глыбінных працэсаў фарміравання нашай інфармацыйнай прасторы. Пэўныя тэндэнцыі дадзенага перыяду пазней перараслі ў заканамернасці, якія істотна ўплывалі на развіццё беларускіх мас-медыя. Разгледзім жа некаторыя з асноўных тэндэнцый, уласцівых адзначанаму перыяду.

У гэты час на тэрыторыі этнаграфічнай Беларусі выйшла першая газета - польскамоўная «Газета літаратурная Віленская» («Gazeta literacka Wilenska»), якая выдавалася ў Вільні з 1760 да 1793 г. Па сутнасці яна пакпала пачатак з'яўленню культуралагічнага і грамадска-палітычнага недзяржаўнага друку на Беларусі.

Вядома, узнікненне першага перыядычнага выдання ў нашым краі адбылося пазней (з-за шэрага ваенна-палітычных фактараў), чым у Расійскай імперыі, Паўночнай Італіі, Францыі, Галандыі, Злучаным Каралеўстве Вялікабрытаніі. Разам з тым на Беларусі газета з'явілася раней, чым у шэрагу славянскіх народаў - балгараў, грэкаў, албанцаў, румынаў, трансільванцаў, мадзьяраў, славакаў, сербаў, македонцаў, харватаў, славенцаў і інш. Няма падстаў сцвярджаць, нібыта наша Айчына празмерна спазнялася ў сваім інфармацыйным развіцці. Калі арыентавацца не на імперскія метраполіі (якія мелі багата газет-«аднадзёнак», але не многа стабільных перыядычных выданняў), а разглядаць сітуацыю ў гістарычным кантэксце развіцця народаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, дык мусім канстатаваць, што па сваіх паказчыках Беларусь знаходзілася ў шэрагу інфармацыйна развітых краін свету.

У 1776 г. да «Газеты літаратурнай Віленскай» дадалася польскамоўная «Гродзенская газета» («Gazeta Grodzienska»), якая выдавалася ў Гродне да 1783 г. У лістападзе - снежні 1792 г. выдаваліся «Гродзенскія ведамасці» («Wiadomosci Grodzienskie»), а з 1794 г. распачаўся выпуск найбольш стабільнага за ўсю гісторыю беларускай журналістыкі выдання - «Кур'ер Віленскі» («Kurier Wilenski», заснаваны ў Віленскай езуіцкай акадэміі). У ліпені - лістападзе 1812 г. адміністрацыя Мінскага дэпартамента з дазволу французскай аку-

пацыйнай улады выдавала польскамоўную «Часовую Мінскую газету» («Tymczasowa Gazeta Minska»). Пасля гэтага звыш двух дзесяцігоддзяў у інфармацыйнай прасторы функцыянаваў адзіны «Літоўскі веснік», новых газет не з'яўлялася.

Адзначым, што гэтыя польскамоўныя выданні ў пэўнай ступені спрыялі паланізацыі Беларусі. У культуралагічным жа аспекце той жа «Літоўскі веснік», які з 1841 г. друкаваўся на рускай і польскай мовах пад назвай «Виленский вестник», паўтара стагоддзя з'яўляўся цэнтрам абмеркавання праблем развіцця беларускага, польскага, літоўскага, рускага, украінскага, татарскага і яўрэйскага народаў на тэрыторыі нашай Бацькаўшчыны (Мархель 1972, 90).

Практычна з моманту ўзнікнення першыя выданні аказаліся пад моцным дзяржаўна-адміністрацыйным ціскам, што прывяло да значнага змянення іх тэматыкі. Так, у 1792 г. паводле ўказа караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага, незадаволенага тым, як у перадавых артыкулах «Гродзенскай газеты» абмяркоўваліся надзённыя грамадска-палітычныя праблемы, у Гродне была ўведзена пасада газетнага цэнзара. Пад ціскам цэнзара рэдакцыйныя артыкулы замяняліся паведамленнямі з іншых выданняў. Што ж тычыцца «Літоўскага весніка», дык у 1833 г. газета, якая дагэтуль перажывала сур'ёзны фінансавы крызіс, была прызнана органам улад Паўночна-Заходняга краю і пачала атрымліваць казённыя субсідыі - у выніку на яго старонках засталася практычна толькі афіцыйная інфармацыя.

Прагрэсіўная частка грамадства, у прыватнасці прадстаўнікі таварыстваў філаматаў і філарэтаў, ужо ў пачатку 20-х гг. XIX ст. балюча адчувапа неабходнасць з'яўлення «неказённага» выдання - часопіса, які адпавядаў бы не задачам ўладнай эліты, але духоўным запатрабаванням грамадскасці. Найбольш яскрава гэтая канцэпцыя была агучана ў 1820 г. філаматам Юзафам Кавалеўскім (у будучым - знакамітага рускага вучонага-манголаведа) у нататках «Меркаванні пра задуманае перыядычнае выданне»: «...галоўнай ізадачай нашага часопіса павінна быць павышэнне ўзроўню асветы ў грамадстве, што патрабуе ў першую чаргу... выхавання любові да айчыны, абуджэння цікавасці да вучобы, выяўлення павучальных матэрыялаў і крыніц, умелага іх выкарыстання для задавальнення патрэб нашага краю... Пажадана, каб дзве асаблівасці вылучалі наш часопіс - айчынная накіраванасць і арыгінальнасць. Да першай залічаю ўсё, што адносіцца да нашага краю, звесткі, вартыя ўвагі нашых людзей, як палітычныя, так і навуковыя, якія могуць абудзіць у абыякавых сэрцах любоў да айчыны і пабольшыць гэтай любові ў свядомых патрыётаў... Другой асаблівасцю хай будзе арыгінальнасць, гэтак занядбаная сёння ў перыядычных і неперыядычных выданнях, якія часта напіхваюцца абы-якімі матэрыяламі і псуюць у чытачоў густ, прыносячы гэтым вялікую шкоду...» (Кавалеўскі 1998, 332-333).

Вызначаныя Ю. Кавалеўскім накірункі часопіснай «асаблівасці» і на пачатку XXI ст., на наш погляд, застаюцца тымі «маякамі», на якія варта арыентавацца нашым сучасным дзяржаўным і недзяржаўным выданням.

Імкненне да вышэйзгаданай «асаблівасці» паўплывала на станаўленне ў першай чвэрці XIX ст. маладзёжнага і навуковага друку Беларусі. Мы маем на ўвазе, напрыклад, першы маладзёжны ілюстраваны польскамоўны літаратурна-навуковы часопіс «Месячнік Полацкі» («Miesiecznik Polocki»), які выдаваўся ў Полацкай езуіцкай акадэміі з 1818 да 1820 г. (выданне спынена пасля выгнання ордэна езуітаў з Расійскай імперыі). Заснавальнікам часопіса быў філосаф Вінцэнт Бучынскі, адказным сакратаром - прафесар фізікі і доктар філасофіі Юзаф Цытовіч, аўтарамі - выкладчыкі і студэнты акадэміі. Усяго выйшла 14 нумароў, у якіх было змешчана 85 артыкулаў. Часопіс меў шэсць раздзелаў: літаратуры і вольных навук, маральна-філасофскі, фізіка-матэматычны, гістарычны, крытыкі і літаратурных навін. Побач з гістарычнымі і літаратуразнаўчымі матэрыяламі ў іх друкаваліся ўрыўкі са старажытных рукапісаў акадэмічнай бібліятэкі, а таксама арыгінальныя творы. Тытульны ліст аздабляўся выказваннем Гарацыя: «Што праўдзіва і прыгожа, пра тое кпапачуся і пытаюся, і ўвесь таму адданы» (Арлоў 2000, 339).

Па многіх аспектах навукова-грамадскага жыцця з «Месячнікам Полацкім» палемізавала іншае значнае выданне на тэрыторыі этнаграфічнай Беларусі -

штомесячны польскамоўны навукова-літаратурны часопіс «Віленскі дзённік» («Dziennik Wilenski», фактычны орган Віленскага універсітэта, выдаваўся ў 1805-1806, 1815-1830 гг., рэдактар - прафесар хіміі Анджэй Снядэцкі). Палеміка, якая разгортвалася на старонках гэтых выданняў, не толькі мела вялікае значэнне для развіцця грамадскай думкі, але і ўкараняла традыцыю талерантнай палемікі.

Калі ў XVII ст. дыскусіі насілі рэлігійна-палітычны характар і спараджалі радыкальныя вынікі, то на пачатку XIX ст. з'явіўся прыклад талерантнай палемікі, калі апаненты, няхай і сур'ёзна крытыкуючы адзін аднаго, імкнуцца ў выніку да агульнай мэты - да паляпшэння народнага дабрабыту, да ўмацавання ў масавай свядомасці гуманістычных ідэалаў. На жаль, далека не заўсёды ў нашай далейшай гісторыі традыцыя талерантнай палемікі будзе пераважаць над палемікай радыкальнай.

Важнай акалічнасцю для нашага даследавання з'яўляецца і тое, што амаль усе публікацыі ў «Віленскім дзённіку» падпісваліся сапраўднымі прозвішчамі аўтараў. Гэта было новай з'явай у журналістыцы Беларусі. Ананімнасць і безаблічнасць саступалі аўтарскаму пачатку ў інфармацыйнай прасторы.

У літаратурным раздзеле «Віленскага дзённіка» друкаваліся творы А. Міцкевіча, А. і І. Ходзькаў, А. Адынца, Т. Зана і інш. З 1826 г. пачалі выдавацца спецыяльныя выпускі часопіса: «Гісторыя і літаратура», «Навука і мастацтва», «Мастацкая літаратура», «Прыкпадныя навукі», «Навуковыя навіны». Найбольшую колькасць падпісчыкаў часопіс меў у 1822-1825 гг., калі на яго старонках асвятляліся падзеі палітычнага жыцця ў Еўропе, абмяркоўваліся грамадскія праблемы, каменціраваліся ўрадавыя пастановы. Але з пачаткам царавання Мікалая I (1825-1855 гг.) ліберальны курс царызму змяніўся на рэпрэсіўны. Са старонак часопіса практычна цалкам знікла публіцыстыка, і, як вынік, пачала змяншацца колькасць падпісчыкаў. Урэшце ў 1831 г. «Віленскі дзённік» быў забаронены.

Адначасова з «Віленскім дзённікам» і «Месячнікам Полацкім» у 1816-1822 гг. у Віленскім універсітэце выдаваўся польскамоўны сатырычны штотыднёвік «Вулічныя весці» («Wiadomosci Brukowe», орган маладзёжнага літаратурна-грамадскага таварыства шубраўцаў (гультаёў)). Матэрыялы, якія змяшчаліся на старонках «Вулічных весцяў», раскрывалі пачварнасць прыгонніцтва, высмейвалі цемрашальства, разумовую абмежаванасць, душэўную пустату, п'янства, напышлівую «еўрапейскасць» (франкаманію) мясцовых абывацеляў, суцяжніцтва і фанабэрыстасць шляхціцаў і магнатаў. Аўтары штотыднёвіка з асветніцкіх пазіцый патрабавалі роўнасці ў грамадскіх стасунках, але нецярпіма ставіліся да народных звычаяў, лічылі іх заганамі. Акрамя таго, лібералізм шубраўцаў сумяшчаўся з выразным антысемітызмам. І ўсё ж сам факт існавання «Вулічных весцяў» спрыяў развіццю традыцыі маладзёжнага свабодамыслення, якая своеасаблівым чынам адбілася ў сучасных недзяржаўных выданнях вышэйшых навучальных устаноў Беларусі кшталту часопіса «Паміж» (выданне Беларускага калегіума), «Студэнцкая думка», «Aspirin T+» (беларускамоўная газета мінскіх аспірантаў) і г. д.

Пасля закрыцця Віленскага універсітэта навукова-інтэлектуальнае жыццё Беларусі канцэнтравалася вакол польскамоўных выданняў, якія рэдагаваў знакаміты гісторык, этнограф, археолаг, публіцыст і грамадскі дзеяч Адам Кіркор (1818-1886): навукова-літаратурнага альманаха «Радэгаст» («Radegast», 1843 г.), штогодніка «Разумовыя дзённікі» («Dziennik razymovu», выйшлі тры нумары ў 1845-1846 гг.), часопіса «Віленскі зборнік» («Тека Wiienska», выйшлі 6 нумароў у 1857-1858 гг.). Гэтыя выданні сведчылі аб працягу традыцыі навукова-публіцыстычнага друку на Беларусі. У гэтых альманахах і штогодніках чытачы Расіі і Польшчы, якія дагэтуль мелі досыць цьмянае ўяўленне пра беларушчыну, знаёміліся з багаццем духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў, з гістарычнымі і этнаграфічнымі своеасаблівасцямі нашага народа, у выданнях падкрэсліваліся этнічная і сацыяльна-бытавая характарыстыкі тыпаў беларусаў, адзначалася самастойнасць беларускай мовы, выказвалася ідэя аб цэласнасці беларускай культуры як шматвяковай з'яве (Янчук 1888, 81).

Не менш значнымі былі і віленскія польскамоўныя выданні публіцыста і фалькларыста Рамуальда Падбярэскага (1812-1856) - літаратурна-навуковыя альманахі «Літаратурны штогоднік» («Rocznik Literacki», т. 1-4, 1843-1849 гг.) і «Навукова-літаратурны дзённік» («Pamietnik Naukowo-Literacki», т. 1-2, ч. 1-6, 1849-1850 гг.), у якіх часта змяшчаліся матэрыялы, звязаныя з Беларуссю (Шыбека 2003, 158). Сам Падбярэскі быў аўтарам бадай першага агляднага крытычнага артыкула пра беларускую літаратуру - «Беларусь і Ян Баршчэўскі» (прадмова да першага тома «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастичных апавяданнях», 1844 г.). Гэты грунтоўны артыкул, у якім упершыню вызначаліся рысы народнасці беларускай літаратуры, стаў адным з вытокаў літаратуразнаўчай і мастацказнаўчай галін.

Безумоўна, нас не можа не хваляваць пытанне: наколькі беларускімі, па сутнасці, з'яўляліся польскамоўныя «Месячнік Полацкі», «Віленскі дзённік», «Вулічныя весці», «Літаратурны штогоднік», «Навукова-літаратурны дзённік»?

Адзначым, што ў дадзеным выпадку трэба ўлічваць акалічнасці эпохі. З часоў Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага Беларусь знаходзілася ў сферы ўплыву еўрапейскай культуры. Сродкам далучэння да яе доўгі перыяд была польская мова. Дык не дзіва, што ў пачатку XIX ст. польская мова для нашых суайчыннікаў была мовай навукі і асветы, гэтаксама, як у часы сярэднявечча - лацінская, а зараз - англійская. Паколькі пасля 1815 г. у Еўропе распачаўся працэс імклівага станаўлення прафесійных нацыянальных культур, дык і на Беларусь гэтыя перамены ў ідэалогіі пранікалі дзякуючы польскай мове. Таму І на беларускіх землях у першай чвэрці XIX ст. мастацтва адмаўлялася ад касмапалітычных канонаў класіцызму і абапіралася на народную творчасць, адлюстроўвала жыццё звычайных людзей. Адпаведна і ў інфармацыйнай прасторы ўзрасла цікавасць да гісторыі, этнаграфіі, археалогіі і філалогіі, да гераічнага мінулага нашага народа і яго сакавітай мовы.

Такім чынам, ёсць падставы сцвярджаць, што польская мова ў інфармацыйнай прасторы беларускіх губерняў у адзначаны перыяд была сродкам далучэння да еўрапейскіх інфармацыйных і культуралагічных плыняў, спрыяла яе ідэйнаму ўзбагачэнню.

Мы мусім канстатаваць наступныя вынікі. Па-першае, па сваіх паказчыках Беларусь у XVIII-XIX ст. знаходзілася ў ліку інфармацыйна развітых краін свету. Па-другое, хаця ў тыя часы ў нашай інфармацыйнай прасторы пераважаў польскамоўны друк, асновай яго тэматыкі служыў беларускі матэрыял, і такім чынам названыя выданні, па сутнасці, назапашвалі патэнцыял для будучага грамадскага прарыву да Беларускай Ідэі. Па-трэцяе, заслуга навукова-літаратурнага друку мела дэтэрмінантны характар, бо паколькі ідэі беларушчыны былі сфармуляваны на высокім навукова-інтэлектуальным узроўні, дык з цягам часу павінны былі ўкараніцца і ў інфармацыйнай прасторы.

І хаця ўжо ў сярэдзіне XIX ст. стала відавочна, што беларусы маюць выразную патрэбу ў тым, каб іх інфармацыйная прастора набыла нацыянальнае адценне, да з'яўлення беларускамоўных выданняў, на жаль, заставалася яшчэ шмат часу.

## ЛІТАРАТУРА

Арлоў У. Таямніцы Полацкай гісторыі. Мн., 2000. С. 309.

Кавалеўскі Ю. Меркаванні пра задуманае перыядычнае выданне // Філаматы і філарэты: 36. / Уклад., пер. польскамоўн. твораў, прадм., біяграфічныя даведкі пра аўтараў і камент. К. Цвіркі. Мн., 1998. С. 332-333.

Мархель У. «Кур'ер Віленьскі» як крыніца для вывучэння гісторыі культуры Беларусі // Из истории книги, библиотечного дела и библиографии в Белоруссии. Мн., 1972. Вып. 2. С. 90.

Шыбека 3. Нарысгісторыі Беларусі (1795-2002). Мн., 2003. С. 158.

Янчук Н.А.К. Киркор: Краткий очерк жизни и деятельности. М., 1888. С. 81.

Паступіў у рэдакцыю 25.02.05.

*Ягор Фёдаравіч Конеў* - кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры.